# Уладзімір Мікалаевіч ГАЎРЫЛОВІЧ

Нарадзіўся 30 жніўня 1967 года ў вёсцы Вятчын Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага (1991). Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Вятчынскай сярэдняй школе, дырэктарам Бялёўскай СШ у Жыткавіцкім раёне, галоўным рэдактарам раённай газеты «Новае Палессе» (Жыткавічы), гарадской – «Гомельскія ведамасці» (Гомель), уласным карэспандэнтам газеты Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Беларускі Час» па Гомельскай вобласці. Цяпер – старшыня Гомельскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Аўтар 23 кніг прозы «Споднія яблыкі» (1999), «Глыбокія карані» (2001), «На мяжы» (2003), «Плата за каханне» (2007), «Забранае шчасце» (2007), «Анёлак, мой Анёлак» (2013), «Цяпло маладзіка» (2014), трылогіі «Палешукі» (2017, 2018), «Агледзіны» (2019) і 4 кніг публіцыстыкі «...Дзе над горадам лунаюць буслы» (2000), «Крокі па роднай зямлі» (2005), «Запрашэнне» (Швейцарыя, 2007), «З людзьмі і для людзей» (2019) інш. Лаўрэат рэспубліканскага конкурсу «Лепшы твор 2007 года ў галіне прозы» за кнігу «Плата за каханне», літаратурных прэмій памяці Мікалая Мельнікава (Расія, 2009), Міжнароднай літаратурнай прэміі Баяна (Расія, 2011), літаратурных прэмій Т.Р. Шаўчэнкі, імя У.І. Нарбута ( Украіна, 2014), а таксама і іншых прэстыжных літаратурных узнагарод.

## ПЕРАД РАСПРАВАЙ

*Урывак з аповесці «Святая Параскева»*

Ігнат быў вельмі далікатны з ёй – здавалася, што ў гэтую іх першую ноч пасля доўгага растання яна ледзь не памерла ад распаленага, нястрымнага кахання і шчасця, якое нечакана вярнулася ў гэтую хату. Але разам з бязмежна-ап'яняючай асалодай, якая напоўніла ўсё цела жанчыны, у яе сэрца зноў вярнулася неадчэпная трывога за мужа, ад якога больш года не было вестак, а зараз – ад учарашняга яго прызнання: не можа заставацца тут і павінен сысці да партызанаў.

«Што ж будзе заўтра, Ігнатка?» – зноў і зноў шэптам пытала ў яго Параскева, але муж маўчаў. Жанчына зразумела: адказу на гэта пытанне не ведаў ніхто, нават яе каханы.





Нарэшце, яна вырашыла падняцца, і паціху выслізнула з ложка.

«Ранняя пташка, Параскевачка мая, ты куды?» – сонным голасам спытаў Ігнат. «Спі, каханы мой, спі...» – яна нахілілася і з падзякай за гэту доўгачаканую і шчаслівую ноч салодка пацалавала мужа. – «Ты хіба забыўся: заўсёды раненька ўстаю...»

Світала. Накінуўшы на плечы хустку, Параскева выйшла з хаты на ганак і адразу адчула штосьці нядобрае: у вільготным нерухомым паветры выстаяўся рэзкі, гаркавата-едкі дым. Застыўшы на адным месцы, яна доўга спрабавала зразумець, з якога боку ён прыбіўся ў Вяснянку, але – безвынікова. Тады басанож прайшлася па двары, ногі прыемна ўгрузалі ў мяккую халаднаватую ад расы траву. Цяпер жанчына зразумела: смалісты пах гары адчуваўся паўсюль.

Першае, пра што ёй падумалася,– недалёкі лясны пажар. Разважала: усё было падобна на яго, не раз з бацькам-леснікам ёй даводзілася тушыць такія падпалы ці самазагаранні. Хутчэй за ўсё, нягледзячы на багатую вільгаць ад прайшоўшых напярэдадні дажджоў, загарэўся недалёкі хвойнік ці далейшы сухі сасновы бор. Менавіта адтуль, ад дарогі, якая вяла да суседніх вёсак і да далёкага мястэчка, падумала жанчына, паўзучы, едкі дым, нягледзячы на зацішнае надвор'е, і дабраўся ў Вяснянку.

Аднак штосьці яе ўсё ж такі насцярожвала ў гэтым ужо застоеным, цяжкім, вельмі чадным паху. Параскева, аднак, ніяк не магла зразумець, што менавіта, а таму адчуванне чагосьці дрэннага, нейкай страшнай бяды, што павінна здарыцца, не пакідала яе ўжо ні на хвіліну.

Раптам дзесьці ўдалечыні пачуўся дзіўны шум. Доўга перабірала ў памяці, на што ён падобны, і штосьці ёй падказала: працаваў рухавік аўтамабіля. Ён то знікаў, то з'яўляўся, і зноў цішэў, то ўвогуле прападаў.

Знянацку ў ранішняй дрымотнай цішы, напоўненай гэтым густым дымлівым смогам, данёсся да яе ўсхваляваны голас. Параскева, пачуўшы яго, аж скаланулася ад нечаканасці.

— Ой, добра, што не спіш, суседачка...

Яна азірнулася, угледзелася: адсюль у сізай дымцы заўважыла постаць жанчыны. Праз імгненне зразумела, хто гэта: ля брамкі маладжавая, ёй было не больш за сорак пяць гадоў, цётка Ганна. Быццам прыцягвала яе невядомай сілай, заваражана пакрочыла жанчыне насустрач.

Калі параўнялася з суседкай, тая падалася ёй вельмі разгубленай. Кабета задыхалася, відаць, хутка бегла сюды, а сваім выглядам – была ў спадніцы і толькі споднім сарочцы,– не на жарт спалохала нявестку Міронавых.

— Бяда, мілая...— раптам заплакала Ганна, ледзь перавёўшы дыханне. – Немцы Высокую Рудню спалілі... Смог бачыш які, да нас ён адтуль дабраўся...

— Як спалілі? – знямела ад страшнай навіны Параскева.

— Спалілі... Няма больш Рудні. Ето ж толькі прыбег ледзь жывы пляменнік, Віцька, сястры маёй малодшай сын, пагодак майго Колькі. Дык

нельга глядзець на хлопца. Божа мой! Плача, заікаецца, нацярпеўся такога страху. Кажа, заўчора ў Высокую Рудню прыскакаў вершнік-чэх, сказаў, каб сыходзілі ўсе людзі, бо спаляць іх. Але яму ніхто не паверыў: не могуць людзі людзей паліць. І ніхто нікуды не з'ехаў. А пад раніцу немцы і паліцаі вёску акружылі, з хат усіх выгналі ў чым былі, ды сказалі, што калі не выдадуць партызан, камуністаў і камсамольцаў, ды і ўсіх тых, хто ім дапамагае, хлеб пячэ, расстраляюць. Але хто ж каго выдасць? Спрадвеку жылі там людзі па-чалавечы, дружна, я ж добра ведаю. Шмат каго, хто не падпарадкаваўся і не выканаў загаду, упарціўся, не хацеў сыходзіць, і пастралялі ў хатах, а потым усіх, антыхрысты, жыўцом у кароўніку... Надзейка, сястра мая, Віцьку ў бульбянішча за хатай піхнула, аднаму Богу вядома, як і здагадалася. На свае вочы малец бачыў усё: як мамку яго з маленькай сястрычкай Нюрачкай вялі, як людзі крычалі ў тым агні пякельным… Дзіця ж горкае, блудзіў усю ноч па лесе, пакуль прыбіўся да нас. Яшчэ чуў хлапец, як паліцаі, якія вялі на смерць людзей, абмовіліся, што заўтра чарга і нашай Вяснянкі… Хлопчык вунь у маёй хаце трасецца: «Цікаць, цётачка, трэба!!!»

Ганну раздзіралі слёзы.

Разгубленая Параскева, абняла суседку і таксама праз слёзы прамовіла:

— Божанька, прымі іх нявінныя душы… А я ж падумала, што гэта ў лесе недзе пажар…

— Не, не пажар, мілая, Рудні больш няма. Спалілі каты. І што нам зараз рабіць, куды ісці, бо прыйдуць, прыйдуць нехрысці… – дрыжачым голасам працягвала суседка. І раптам замоўкла, штосьці абдумваючы, прымаючы нейкае рашэнне.

— Можа, абыйдзецца? – усё яшчэ ніяк не магла паверыць у пачутае Параскева.

— Не, дзеванька мая. Бяда будзе. Вернае дзела: у лес, да балота, да возера трэба з дзецьмі сыходзіць. Перасядзець дзень-другі там, а потым як дасць Бог… Можа, нас не зачэпяць. Як ціха будзе – вернемся ў вёску.

— Позна, цётка Ганна, яны ўжо тут… – жахнулася Параскева, пабачыўшы, як ля крайняй хаты, метраў за трыста адгэтуль, вырваўшыся з лесу, як чорны крумкач, спынілася грузавая машына. За ёю – яшчэ адна. Потым яшчэ. З машын, пазначаных крыжамі, выскоквалі нямецкія салдаты. Неўзабаве Вяснянка была акружана.